Чаму ў краінах Лацінскай Амерыкі не вельмі актыўна выкарыстоўваецца вопыт мадэрнізацыі грамадства, які ёсць у ЗША і заходнееўрапейскіх краінах?



**Эрнеста Чэ Гевара** (1928—1967) — лаціаамерыканскі рэвалюцыянер, адзін з кіраўнікоў Кубінскай рэвалюцыі. Нарадзіўся ў сям'і архітэктара ў Аргенціне, атрымаў прафесію ўрача. У гады кіравання Х. Перона быў вымушаны эміграваць з Аргенціны. У 1955 г. у Мексіцы сустрэўся з Ф. Кастра і з таго часу звязаў свой лёс з барацьбой кубінскага народа за незалежнасць. Пасля перамогі Кубінскай рэвалюцыі актыўна ўдзельнічаў у пабудове сацыялізму на Кубе. Быў начальнікам гарнізона крэпасці Ла-Кабанья (Гавана), дырэктарам Упраўлення прамысловага развіцця краіны, прэзідэнтам Нацыянальнага банка Кубы, міністрам прамысловасці. Пазней удзельнічаў у арганізацыі партызанскага руху ў Конга і Балівіі. У адным з баёў у Балівіі створаны ім партызанскі атрад быў акружаны і разгромлены. Гевара быў паранены, захоплены ў палон і забіты.

## § 46. Лакальныя войны і канфлікты

Пасля Другой сусветнай вайны свет фактычна падзяліўся на сферы ўплыву двух блокаў на чале з СССР і ЗША, што ўвесь час знаходзіліся ў процідзеянні. Канфрантацыя паміж імі ўвайшла ў гісторыю пад назвай «халодная вайна». Гэта процістаянне не вылілася ў сусветную вайну, але прыводзіла да войнаў і канфліктаў у асобных краінах і рэгіёнах свету. Аднак і пасля распаду СССР лакальныя войны і канфлікты не спыніліся.

**Араба-ізраільскі канфлікт.** У 1947 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рашэнне аб спыненні брытанскага мандата на Палесціну і стварэнні на яе тэрыторыі дзвюх дзяржаў: арабскай і яўрэйскай. У ***1948 г.*** была абвешчана яўрэйская дзяржава *Ізраіль*. Суседнія арабскія дзяржавы адразу ж пачалі супраць яе вайну. Пры падтрымцы СССР і ЗША Ізраіль атрымаў важную перамогу над больш слабымі арабскімі арміямі. У ходзе вайны Ізраіль захапіў большую частку тэрыторыі Палесціны, адведзеную ААН для Палесцінскай арабскай дзяржавы, і заходнюю частку Іерусаліма.

Затым адбыліся канфлікты ў *1956, 1967, 1973* і *1982 гг.*, у выніку якіх Ізраіль яшчэ больш умацаваў свае пазіцыі. Да гэтага часу ён захоўвае пад сваім кантролем захопле-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ныя ў Сірыі Галанскія вышыні і Іерусалім. Але стрыжнем блізкаўсходняга канфлікту з'яўляецца палесцінская праблема.

ААН прызнала і пацвердзіла права арабаў Палесціны на ўласную дзяржаўнасць. Барацьбу за стварэнне Палесцінскай дзяржавы ўзначаліла *Арганізацыя вызвалення Палесціны (АВП)*. У 1993 г. прадстаўнікі Ізраіля і АВП дамовіліся аб увядзенні палесцінскай аўтаноміі на Заходнім беразе Іардана і ў сектары Газа. Ізраіль вывеў адтуль свае войскі, іх месца занялі палесцінская паліцыя і адміністрацыя. Гэта быў важны крок на шляху стварэння незалежнай Палесцінскай дзяржавы.



*Злева направа*: палесцінскі лідар Ясір Арафат, міністр замежных спраў Ізраіля Шымон Перэс, прэм'ер-міністр Ізраіля Іцхак Рабін на ўручэнні Нобелеўскай прэміі міру. 1994 г.

**Вайна ў В'етнаме.** З XIX ст. В'етнам разам з Лаосам і Камбоджай быў часткай Французскага Індакітая. У гады Другой сусветнай вайны краіну захапіла Японія. В'етнамскі народ пад кіраўніцтвам камуністычнага лідара *Хо Шы Міна* ў жніўні 1945 г. здзейсніў вызваленчую рэвалюцыю, у выніку якой была ўтворана Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам (ДРВ).

Францыя не змірылася са стратай калоніі і пры падтрымцы ЗША накіравала ў В'етнам свае войскі. Хо Шы Мін заклікаў да ўсенароднай вайны супраць французскіх каланізатараў. Вырашальная бітва завяршылася перамогай В'етнамскай народнай арміі. У ходзе мірных перамоў у *1954 г.* былі падпісаны *Жэнеўскія пагадненні*. Яны прызнавалі незалежнасць В'етнама. Яго тэрыторыя была часова падзелена па 17-й паралелі. Аднак з'яднаць поўдзень і поўнач не атрымалася. У Паўднёвым В'етнаме ўмацаваўся праамерыканскі палітычны рэжым.

У 1960 г. у Паўднёвым В'етнаме быў утвораны Нацыянальны фронт вызвалення, які сфарміраваў уласныя ўзброеныя сілы. Дзякуючы падтрымцы Паўночнага В'етнама партызаны дзейнічалі ўсё больш і больш паспяхова. Гэта прымусіла ЗША ўзмацніць ваенную дапамогу паўднёвав'етнамскаму ўраду, а затым і пачаць вайну супраць ДРВ. З лютага 1965 г. амерыканскія ВПС ажыццяўлялі бамбардзіроўкі в'етнамскай тэрыторыі з выкарыстаннем спецыяльных хімічных рэчываў, шарыкавых бомбаў і напалму. Сімвалам пакут і мужнасці в'етнамскага народа стала спаленая вёска Сангмі. На баку ДРВ ваявалі савецкія добраахвотнікі — ваенныя спецыялісты і лётчыкі.

У 1968 г. у Парыжы пачаліся перамовы паміж ДРВ і ЗША, якія доўжыліся чатыры гады. Вынікам стаў выхад ЗША з вайны ў 1973 г. У сакавіку 1975 г. войскі ДРВ пачалі маштабны наступ і занялі Паўднёвы В'етнам. 2 ліпеня 1976 г. была абвешчана

Правообладатель Издательский центр БГУ



Дэмілітарызаваная зона каля вёскі Пханмунджом за 52 км ад Сеула

Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам (СРВ). Так ЗША пацярпелі паражэнне ў В'етнамскай вайне.

**Карэйская вайна.** Пасля руска-японскай вайны над Карэяй быў усталяваны пратэктарат Японіі. 8 жніўня 1945 г. СССР далучыўся да вайны супраць Японіі. Карэя трапіла ў зону дзеянняў савецкіх войскаў. Каб не дапусціць пераходу пад кантроль СССР усяго паўвострава, ЗША распрацавалі план яго падзелу на перыяд ваенных дзеянняў на савецкую і амерыканскую акупацыйныя зоны па 38-й паралелі. У выніку ў 1945 г. у Карэю на поўначы ўвайшла Чырвоная Армія, а на поўдні высадзіліся войскі ЗША.

15 жніўня 1948 г. у Паўднёвай Карэі была абвешчана Рэспубліка Карэя і ўсталяваўся праамерыканскі аўтарытарны рэжым. А на поўначы 9 верасня 1948 г. было абвешчана стварэнне Карэйскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі (КНДР) на чале з былым партызанскім камандзірам *Кім Ір Сенам*.

Пасля вываду савецкіх і амерыканскіх войскаў паміж «дзвюма Карэямі» выбухнула малая пагранічная вайна (1948—1950). *25 чэрвеня 1950 г.* пры падтрымцы Кітая паўночнакарэйскія камуністы пачалі паспяховую наступальную аперацыю супраць Паўднёвай Карэі. У Паўночную Карэю было адпраўлена 5 тыс. савецкіх ваенных спецыялістаў. Па рашэнні Савета Бяспекі ААН авіяцыя ЗША пачала ажыццяўляць «дывановыя бамбардзіроўкі» Паўночнай Карэі. Амерыканцы тайна высадзілі ў Карэі пяхотныя часці. У выніку паўночнакарэйскія сілы былі адкінуты да сухапутнай граніцы з Кітаем. На дапамогу КНДР прыйшлі вялікія атрады кітайскіх «народных добраахвотнікаў». 5 снежня 1950 г. яны адбілі Пхеньян, а ў студзені 1951 г. занялі Сеул. Пагадненне аб перамір'і было заключана *27 ліпеня 1953 г.*, краіна была падзелена па 38-й паралелі. Мірны дагавор так і не быў падпісаны. З 1953 г. на паўвостраве існуюць дзве дзяржавы. Тым самым было ажыццёўлена размежаванне сфер уплыву ў Азіі паміж СССР і ЗША.

**Войны ў Афганістане.** У 1973 г. група армейскіх афіцэраў скінула каралеўскую ўладу. У краіне ўсталявалася ваенная дыктатура. Актыўную барацьбу супраць яе вяла Народна-дэмакратычная партыя Афганістана (НДПА), якая абвясціла сваёй мэтай пабудову сацыялізму. 27 красавіка 1978 г. часці афганскай арміі, якія падтрымлівалі НДПА, узнялі паўстанне, захапілі прэзідэнцкі палац і скінулі ўрад. Рэвалюцыйны савет, што прыйшоў да ўлады, абвясціў 30 красавіка 1978 г. Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан (ДРА). Але сацыялістычныя рэформы і жорсткія меры новай улады, якія ў шэрагу выпадкаў уключалі расправы з асобнымі плямёнамі, сутыкнуліся

Правообладатель Издательский центр БГУ

з супраціўленнем буйны́х землеўладальнікаў, сялян і рэлігійных дзеячаў. У Афганістане пачалася грамадзянская вайна. У снежні 1978 г. паміж урадамі ДРА і СССР быў заключаны Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве. У сваю чаргу, афганскія антыўрадавыя сілы атрымлівалі дапамогу ад ЗША.

У верасні 1979 г. у Афганістане адбылася спроба дзяржаўнага перавароту. Па запрашэнні афганскага боку 27 снежня 1979 г. Савецкі Саюз увёў свае войскі ў гэту дзяржаву. У выніку СССР быў уцягнуты ў працяглы і кровапралітны канфлікт. Апазіцыйныя сілы атрымлівалі актыўную ваенную дапамогу ад Злучаных Штатаў. У канцы 1988 — пачатку 1989 г. СССР вывеў свае войскі з Афганістана. Рэвалюцыйны рэжым паў пасля спынення ў 1992 г. эканамічнай дапамогі з боку Расіі. Аднак грамадзянская вайна працягнулася. У выніку Афганістан апынуўся пад поўным кантролем ЗША.

**Войны ў зоне Персідскага заліва.** У канцы XX ст. у небяспечны ачаг напружанасці ператварылася зона Персідскага заліва — адзін з найбуйнейшых нафтаносных рэгіёнаў свету. 2 жніўня 1990 г. іракскія войскі пад кіраўніцтвам прэзідэнта Садама Хусейна анексавалі багаты на нафту Кувейт. ЗША і іх саюзнікі не магі дапусціць узмацнення Ірака ў блізкаўсходнім рэгіёне. У студзені 1991 г. яны ажыццявілі паветраную аперацыю «Бура ў пустыні». С. Хусейн быў вымушаны пакінуць Кувейт і знішчыць аб'екты, якія будаваліся для вытворчасці ядзернай зброі. Гэта вайна да мяжы аслабіла пазіцыі рэжыму Хусейна ў рэгіёне.

Аднак ЗША імкнуліся да ўсталявання поўнай гегемоніі на Блізкім Усходзе. Пад выглядам неабходнасці знішчэння зброі масавага паражэння англа-амерыканская кааліцыя без санкцыі Савета Бяспекі ААН 19 сакавіка ***2003 г.*** ажыццявіла масіраваныя бамбардзіроўкі іракскай тэрыторыі. Праз тры тыдні войскі кааліцыі задушылі апошні ачаг супраціўлення іракскай арміі. Прычынай хуткага падзення рэжыму С. Хусейна стаў раскол іракскага грамадства, здрада ў найвышэйшым кіраўніцтве іракскай арміі і істотная перавага войскаў кааліцыі ва ўзбраенні. У выніку вайны была разбурана інфраструктура іракскіх гарадоў, краіна апынулася на мяжы гуманітарнай катастрофы. ЗША ўзялі пад свой кантроль іракскія нафтавыя радовішчы. Свае войскі з Ірака яны вывелі толькі ў ***2011 г.***



Аперацыя «Бура ў пустыні»

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Растлумачце значэнне паняццяў «лакальныя войны», «рэгіянальныя канфлікты».
2. Якія найбольш вострыя палітычныя і ваенныя канфлікты адбыліся ў другой палове XX — пачатку XXI ст.? Вызначце агульныя прычыны лакальных войнаў і канфліктаў.
3. Якую ролю ў іх адыгрывалі ЗША і СССР? Складзіце табліцу «Лакальныя войны і канфлікты».
4. У чым вы бачыце небяспеку лакальных войнаў? Якія асаблівасці сучасных лакальных войнаў і канфліктаў?
5. Чым вы можаце растлумачыць той факт, што ў традыцыйных войнах 90 % страт складалі ўдзельнікі баявых дзеянняў, а ў сучасных лакальных войнах і канфліктах амаль 80 % загінулых і параненых — цывільнае насельніцтва?

Уваходзячы ў новае тысячагоддзе, чалавецтву неабходна падвесці некаторыя вынікі. Якія ўрокі яно павінна вынесці з XX ст.? Ці дапамагае гісторыя лепей разумець свет вакол нас?

## Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела VII

**1.** Якія фактары садзейнічалі актывізацыі нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Азіі і Афрыкі ў другой палове XX ст.? Ахарактарызуйце працэс дэкаланізацыі. Вызначце яго значэнне.

**2.** Растлумачце значэнне паняцця «неакаланіялізм». У якіх формах ён праяўляецца? Чаму стаў магчымы?

**3.** З якімі праблемамі мадэрнізацыі сутыкнуліся краіны, што сталі на шлях развіцця? Якія асаблівасці мадэрнізацыі ў ісламскіх краінах Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі? Чым тлумачыцца ўздым ісламскага фундаменталізму ў гэтых краінах?

**4.** Прааналізуйце наступныя звесткі і зрабіце высновы: у Бразіліі з 1960 па 1990 г. удзельная вага працоўнай сілы, занятай у сельскай гаспадарцы, скарацілася з 52 да 23 %, у прамысловасці ўзрасла з 18 да 23 %, у сферы паслуг — з 30 да 54 %. У 1980-я гг. сярэднегадавыя тэмпы прыросту ВНП у Лацінскай Амерыцы складалі 1,7 %, у 1990-я гг. яны ўзраслі да 3,2 %. З 1980 па 1995 г. аб'ём знешняй запазычанасці Бразіліі скараціўся з 31,2 % кошту ВНП да 24 %. Рэзкі рост даўгоў назіраўся толькі ў Мексікі (з 30,5 да 69,9 % ВНП).

**5.** Якія прычыны асаблівай палітычнай нестабільнасці ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі? Чым растлумачыць слабасць дэмакратычных рэжымаў у гэтых дзяржавах? Ці можна лічыць, што перыяд ваенных дыктатур для іх пройдзены?

**6.** Групу краін Паўднёва-Усходняй Азіі і Лацінскай Амерыкі, у якіх у канцы XX ст. адбыўся якасны скачок сацыяльна-эканамічных паказчыкаў, сталі называць «новымі індустрыяльнымі краінамі». Назавіце краіны, якія да іх належаць. Якія ўрокі можна атрымаць з вопыту іх мадэрнізацыі?

**7.** Ці можна ўзброеныя канфлікты ў краінах «трэцяга свету» разглядаць як адну з праяў «халоднай вайны»?

Правообладатель Издательский центр БГУ